

НОВАЕ Ў ДЭКРЭТНЫХ ВЫПЛАТАХ

Сямейная газета

РАМАНТЫКА РАМАНЬКОВЫХ

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 КРАСАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 77 (30211)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАРТУН, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«У эканоміцы захоўваецца ўстойлівая станоўчая дынаміка: прырост сакавіка 2024-га да сакавіка мінулага года складае 4,3 працэнта. Захоўвае высокія тэмпы прамысловасць: у студзені — сакавіку 2024 года — 106,5 працэнта. Добрыя вынікі дэманструе сельская гаспадарка (106,8 працэнта). Упэўнена расце і гандаль: рознічны — 113,1 працэнта, аптовы — 105,8 працэнта, што звязана ў многім з апераджальным ростам рэальных даходаў насельніцтва, а таксама стрыманым ростам індэкса спажывецкіх цэн. Гадавая інфляцыя ў сакавіку захавалася на ўзроўні 5,6 працэнта, што разам з эфектыўнай работай эканомікі дае магчымасць забяспечваць высокі ўзровень заработнай платы — больш як 2 тысячы рублёў у лютым гэтага года. Працоўныя пенсіі ў рэальным выяўленні таксама выраслі — на 9,1 працэнта».*

# Палёты ўяўныя, потым — наяве



**У Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі шэраг лабараторных заняткаў праходзіць пры дапамозе дапоўненай і віртуальнай рэальнасці. Падыход цікавы і актуальны для сучаснага пакалення. Ён дазваляе не толькі дасканала вывучыць алгарытм дзеянняў, але і ўбачыць у 3D-плоскасці драбнюткія дэталі механізма.**

**Так, на фота курсанты 3-га курса спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя паветраных суднаў і рухавікоў» Вадзім ШЫБУН і Аляксей КАСАРЭВІЧ выконваюць віртуальны навучальны комплекс па тэхнічным абслугоўванні самалёта BOEING 737NG.**

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- ВУП Беларусі ў першым квартале 2024 года вырас на 4,1 працэнта.
- **У 2023 годзе ў вадаёмах краіны вылаўлена 15,1 тыс. т рыбы, з іх на прамысловы ўлоў прыпадала 56,4 працэнта (8,5 тыс. т).**
- Торфабрыкетныя заводы «Белпалівагаза» дамовіліся аб новых экспартных пастаўках у Казахстан.
- **У Гомельскай вобласці 80 працэнтаў дзяцей-сірот выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях.**
- Раннія яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі, проса) пасеяны на 527,6 тыс. га, што складае 85,7 працэнта да плана.

ISSN 1990 — 763X

24077

9 771990 763008

Абітурыент-2024

## ЧАС МАЛАДЫХ

Сённяшнія абітурыенты валодаюць самай поўнай і падрабязнай інфармацыяй, неабходнай пры паступленні



**Мы ўсё бліжэй падыходзім да аднаго з самых эмацыянальных і хвалюючых перыядаў у жыцці нашага грамадства. І гэта без перабольшання — выпускная і ўступная кампаніі вызначаюць далейшы шлях дзясяткаў тысяч маладога насельніцтва Беларусі. Іх будучыня — гэта будучыня нашай краіны. Такі напружаны для школьнікаў, абітурыентаў, іх бацькоў, настаўнікаў і выкладчыкаў перыяд спецыялісты Міністэрства адукацыі, ВНУ і каледжаў імкнуцца максімальна аблегчыць, напаўняючы актуальнай інфармацыяй па ўступнай кампаніі свае сайты і тэлеграм-каналы.**

СТАР. 3

Прыклад для пераймання

## Прафесійна, аператыўна, па-добраму

**На рэспубліканскім семінары-нарадзе разглядалі актуальныя пытанні дзейнасці службы «адно акно»**

**На семінар, які праходзіў у Брэсце, сабралася каля 80 спецыялістаў з усіх рэгіёнаў краіны. У ходзе нарады падкрэслівалася важнасць аператыўнага і якаснага аказання паслуг, а таксама добрых адносін да грамадзяніна, які звярнуўся ў дзяржаўную структуру. Калі ва ўстанове сустрэлі з усмешкай, падрабязна растлумачылі, дапамаглі, то чалавек выйдзе з добрым настроем і панясе яго ў сям'ю, калектыў, у асяродак суседзяў. Апошняе паспрыяе адсутнасці сацыяльнай напружанасці, вядзе да згоды ў грамадстве. Вось у такім ключы і вялася размова па актуальнай тэме.**



Прадстаўнікі розных рэгіёнаў падзяліліся вопытам, абмеркавалі праблемныя пытанні. Варта сказаць, чаму менавіта Брэст быў выбраны месцам правядзення падобнага мерапрыемства.

СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

# УЗМАЦНЕННЕ БЯСПЕКІ І ПАВЫШЭННЕ СТАТУСУ ЧАЛАВЕКА ПРАЦЫ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання прыступілі да заканадаўчай дзейнасці

**Шэраг законапраектаў, разгледжаных парламентарыямі, мае міжнародны характар. У прыватнасці, праект закона «Аб прыпыненні дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе» прыняты з мэтай забеспячэння нацыянальных інтарэсаў Беларусі і ў якасці адказнай меры на рашэнне краін — членаў НАТА аб прыпыненні дзеяння гэтага Дагавора.**

Беларусь у поўным аб'ёме выконвае абавязацельствы па Дагаворы, у тым ліку няўхільна прытрымліваецца ўстаноўленых гранічных узроўняў наяўнасці ўзбраенняў, ваеннай тэхнікі і асабовага складу Узброеных Сіл, а таксама своечасова прадстаўляе дзяржавам — удзельніцам Дагавора адпаведную інфармацыю і бягучыя апавяшчэнні. Прыпыненне дзеяння Дагавора дзяржавамі — членамі НАТА і іх саюзнікамі абумоўліваюць мэтазгоднасць прыпынення Рэспублікай Беларусь дзеяння абавязацельстваў, якія падлягаюць выкананню па Дагаворы.

Па словах **намесніка міністра замежных спраў Юрыя АМБРАЗЕВІЧА**, у практычным плане гэта азначае прыпыненне прадастаўлення іншым удзельнікам Дагавора інфармацыі аб звычайных узбраеннях і тэхніцы, прыёму і правядзення інспекцый ў мэтах кантролю за выкананнем колькасных абмежаванняў звычайных узбраенняў і тэхнікі, устаноўленых палажэннямі дакумента. «Мы таксама не будзем абавязаны прытрымлівацца ўказаных колькасных абмежаванняў», — удакладніў ён.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ**, законапраект з'яўляецца адэкватнай рэакцыяй на ваенна-палітычную абстаноўку па знешнім перыметры Беларусі, якая існуе. «Сёння вельмі важна ўзмацняць увагу да пытанняў забеспячэння абароны і бяспекі нашай краіны, — перакананы дэпутат. — Прыняцце гэтага законапраекта знаходзіцца ў гэтым рэчышчы. Мы павінны больш уважліва рэагаваць на сітуацыю, якая складваецца, на дзеянні перш за ўсё заходніх краін на граніцах нашай краіны. Прыняцце гэтага закона не абазначае, што Беларусь выходзіць з гэтага пагаднення. Мы прыпыняем свой удзел і гатовы яго аднавіць, калі краіны НАТА вернуцца ў Дагавор і будуць выконваць свае абавязацельствы».

### НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ НА ЗНЕШНІМ КОНТУРЫ

Дэпутаты ратыфікавалі Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве на тэрыторыі Рэспубліцы Беларусь атамнай электрастанцыі ад 15 сакавіка 2011 года. Падпісанне Пратакола выклікана неабходнасцю рэгулявання актуальных пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне эксплуатацыі Беларускай АЭС. Таксама ратыфікаваны Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб парадку ўзаемнага выканання судовых пастаноў па справах аб спагнанні аліментаў ад 3 сакавіка 2015 года. Змяненні, прадугледжаныя Пратаколам, накіраваны на забеспячэнне гарантый грамадзянам аднаго боку Пагаднення дадатковых гарантый па беспераШкоднам спагнанні аліментаў з даўжнікоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны іншага боку Пагаднення.

З мэтай умацавання супрацоўніцтва з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі прыняты адразу два законапраекты, якія датычацца ўзаемадзеяння ў галіне бяспекі і супрацьдзеяння тэрарызму, а таксама ўзаемапаразумення па пытаннях узаемнага прызнання і абмену вадзіцельскіх пасведчанняў.

Як паведаміў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, Пагадненнем аб супрацоўніцтве ў галіне бяспекі і супрацьдзеяння тэрарызму паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў вызначаны кірункі і формы ўзаемнага супрацоўніцтва: абмен інфармацыяй аб учыненых або падрыхтоўчых злачынствах, асобах, якія іх учынілі, новых спосабах учынення злачынстваў і метадах барацьбы са злачыннасцю; правядзенне сумесных мерапрыемстваў і прыняцце мер па прадухіленні злачынстваў; выкарыстанне кантралюванай пастаўкі для выяўлення незаконнага абароту наркотыкаў; каардынацыя дзейнасці ў рамках міжнародных форумаў; аказанне садзейнічання ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў.

Акрамя таго, ратыфікаваны пагадненні паміж урадамі Беларусі і Экватарыяльнай Гвінеі. Адно з іх датычыцца пазбягання двайнога падаткаабкладання і прадухілення ўхілення ад уплаты падаткаў у адносінах падаткаў на даходы і маёмасць. Другое пагадненне звязана з заахвочваннем і ўзаемнай абаронай інвестыцый.

Ратыфікавана і Пагадненне аб правілах выпуску (выдачы), абыходжання і пагашэння ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза складскіх пасведчанняў на сельскагаспадарчую прадукцыю.

### АСАБЛІВЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

Адзін з чаканых законапраектаў — «Аб змяненні законаў па пытаннях ветэранаў» — разгледжаны ў першым чытанні. У праекце закона — два блокі ключавых змяненняў. Перш за ўсё, яны звязаны з узмацненнем сацыяльных ільгот і гарантый для асобных катэгорый насельніцтва: ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, былым вязням фашызму і воінам-інтэрнацыяналістам. Павялічваецца матэрыяльная падтрымка ваеннаслужачым, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за бездакорную службу ў тыле падчас Вялікай Айчыннай вайны; працаўнікам тылу, узнагароджаным за самаадданую працу, былым вязням фашызму.

«Разумеючы іх дастаткова сур'ёзны ўзрост, сёння яны вельмі маюць патрэбу ў пашыранні льгот з боку аховы здароўя, — канкрэтызавала **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Ірына КАСЦЕВІЧ**. — Разглядаюцца такія льготы, як бясплатнае даванне лекаў, тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне, аздараўленне».

Прадугледжаны пэўныя льготы ў сферы аховы здароўя і для воінаў-інтэрнацыяналістаў. Плануецца, што яны будуць атрымліваць бясплатныя лекі, бясплатнае пратэзаванне зубоў, санаторна-курортнае лячэнне.

Наступны блок навацый звязаны са змяненнем падыходаў да статусу ветэрана працы. Прапаноўваецца закласці норму-парог для атрымання гэтага статусу: для жанчыны працоўны стаж павінен складаць 40 гадоў, для мужчыны — 45 гадоў.

Ірына Касцевіч звярнула ўвагу на тое, што гэта новы падыход, але за ім стаіць сучасны погляд на ганаровы статус чалавека працы, які, па яе словах, атрымаць сёння рэальна. Яна паведаміла, што ў працоўны стаж, неабходны для атрымання статусу ветэрана працы, будуць уключацца і вучоба, і служба ў арміі, і водпуск па доглядзе за дзіцем, і водпуск па доглядзе за састарэлымі бацькамі. «Мэта — падняць статус чалавека працы, стымуляваць на працяглую працоўную дзейнасць», — патлумачыла неабходнасць змяненняў старшыня Пастаяннай камісіі. Пры гэтым для грамадзян, якія маюць такі працяглы стаж, прадугледжана павышэнне пенсіі.

Акрамя таго, у другім чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях Следчага камітэта». У прыватнасці, Следчаму камітэту даюцца паўнамоцтвы без згоды фізічных асоб атрымліваць звесткі з інфармацыйных рэсурсаў (сістэм), якія ўтрымліваюць персанальныя даныя, і мець доступ, у тым ліку аддалены, да гэтых рэсурсаў (сістэм).

**Вераніка КАНЮТА.**

Па сутнасці



# Мартыралог ахвяр «дэмакратыі»

**У гімне роднаму краю класік узрушаецца: «Вясна, вясна! Не для мяне ты! Не я табою абагрэты...» Было такое на Беларусі. Цяпер вясна для нас. Але каб зразумець, каб адчуць тую вясну, мала быць з адкрытым сэрцам — яшчэ трэба працаваць розумам. На жаль, у шэрагу выпадкаў цяпер светапогляд звузіўся да пяці-сямі дзюймаў. Замест шчабятання жаўрукоў мы «слухаем» гаджэты. Маўляў, там ісціна. А вораг інфернальна нашэптвае: загубі родны кут, знішчы Беларусь. Маўляў, не такая краіна табе патрэбна. Працуюць прафесіяналы сваёй чорнай справы. А мы і верым. Пакуль вочы не расплюшчацца ад дзейснай праўды.**

Звычайна, калі растае мінулагодні снег, на лясных праталінах, абапал вузкіх сцяжынак, у гушчарах вочы радуюць пралескі. Такія сціплыя і такія прыгожыя. Як вочы Беларусі. Яно было так, і так застаецца. Але не на памежжы. Жахлівая карцінка паўстае перад вачыма пагранічнікаў, якія ахоўваюць нас ад усялякіх правакацый і неспадзяванак, каб мы і далей маглі дыхаць вясной.

Некалі постсавецкага тэлегледача прывучылі да жахаў. Заходняя цывілізацыя — майстар ствараць жудасныя карцінкі, але цяпер гэта не Галівуд, а рэальнасць. Гэта твар заходняй «дэмакратыі». Як толькі сышоў снег — на памежжы адкрылася жудаснае відовішча. Целы мёртвых людзей. Іх называюць мігрантамі, але ж галоўнае — яны ЛЮДЗІ. З другога боку граніцы трупамі раскідваюцца як смеццем. Трупы пакалечаных, закачанелых ад маразоў людзей, да якіх яны не прывыклі, перакідваюць праз дрот на тэрыторыю Беларусі.

Першае і тое, што ляжыць на паверхні, — гэта інструмент інфармацыйна-псіхалагічнай вайны, жаданне паказаць Беларусь нібыта жудаснай дзяржавай, дзе гінуць мігранты. Так і ствараюць фэйкі. А ману пра «дзяржаву-агрэсара» трэба падтрымліваць новай хлуснёй. Але ж тыя, хто прыязджае да нас у краіну праз бязвіз, бачаць усё на свае вочы. А мы бачылі, як афармляюць інфабучу. Усё тыя ж прадзюсары і рэжысёры. Калектыўны Захад. Майстры на лжывыя клішэ. Але гэта не адкрыццё. Гэта такія ў іх тэхналогіі — бяздушныя адносіны да людзей.

Дасюль спажыўцам «невераготнай інфармацыі» дэманструюць пасівелыя ад часу фэйкі пра жорсткасць беларускіх сілавікоў. Шаноўныя еўрапейскія «гуманісты», а трупы збітых людзей — прыклад і доказ вашай еўрапейскай «гасціннасці», мы калі-небудзь убачым у самай «дэмакратычнай» медыяпрасторы? Наўрад ці... Мёртвае дзіця сціскае сваёй ручкай мізінец мёртвай маці. Так яны і ляжалі пад пластом зямлі — нашы следчыя такую карціну ўбачылі, калі займаліся раскопкамі па справе генацыду. Жудасныя сляды калабарацыі мясцовай хеўры з еўрапейскай адміністрацыяй выплываюць на паверхню праз дзесяцігоддзі. Мы дыпламатычна не згадвалі пра гэта заходнім функцыянерам, нават выслухоўвалі іх парады. А яны ж не змяніліся — тая ж палітыка знішчэння.

Памятаеце, як адэпты «еўрапейскай» Беларусі агітавалі за тое, што, маўляў, калі пойдзем па заходнім шляху, хутка, «як у Еўропе», шампунем будзем мыць вуліцы. Некаторым добра прамылі мазгі, асабліва ўкраінцам. Там цяпер мыюць штодня... сотні нябожчыкаў.

Ды і ў самой Еўропе амбрэ стаіць каля муніцыпальных будынкаў, так што шампунем еўрапейскія гарады таксама не пахнуць. Гэта смурод санкцый супраць нас. Фермеры замест сваіх земляў угнаенні ўносяць каля галоўных будынкаў ЕС. А вось свае землі самыя дэмакратычныя нашчадкі самых «невераготных гуманістаў», прабачце, гатовы ўгнойваць трупамі мігрантаў. Праўда, пакуль лічаць больш правільным пакалечаныя целы выкідваць на нашу тэрыторыю.

І гэта не адзінкавыя садысты з вартавых граніц ЕС. Гэта ў іх палітыка такая. І гэта тыя, хто вучыць нас жыццю і вымярае сваёй перакручанай свядомасцю нашу дэмакратычнасць. Нічога дзіўнага. Ужо неадночы на нашай зямлі пасля сябе яны пакінулі раны, якія не загойваліся. На мінулым тыдні ўвесь цывілізаваны свет успамінаў вязняў фашысцкіх канцлагераў. На нашай зямлі такі быў не адзін. Напрыклад, Трасцянец, самы буйны на тэрыторыі Беларусі і постсавецкай прасторы. У лагеры смерці звазілі людзей з акупаваных тэрыторый Савецкага Саюза, а таксама з Аўстрыі, Германіі, Чэхіі, Славакіі ды Польшчы. Тут, каля нашай «брамы памяці», пастаяць бы еўрафункцыянерам. Але на калені ўстаюць нашы людзі. Пасады не важныя. Важна, што мы кансалідаваны адзіным болем, памяццю, Перамогай.

А зараз глыбей і ў гісторыю, і ў сэнсы. Яны ў фатаграфіях тых часоў і сённяшніх. Тыя ж скалечаныя людзі, той жа калючы дрот, і тыя ж аўтары трагедыі, і тыя ж адносіны да «джунгляў». Успамінаецца, як тыя ж самыя функцыянеры павучалі наша пагранічнае ведамства, як працаваць з мігрантамі. Брыдка становіцца. Нас вучыць не трэба. У нашай крыві — міласэрнасць. А вось чаму тыя функцыянеры, нібы ў рот вады набраўшы, ні слова не скажуць сваім еўрапейскім пагранічнікам, якія становяцца забойцамі? Я ведаю, чаму — свабода слова ў іх такая. Адна для «барэлеўскага саду», іншая — для «джунгляў».

Для іх гэта нічога асаблівага. У звычайнай прабірцы замуцілі «Буру ў пустыні», а людзей, сваіх жа паплечнікаў, прадстаўнікоў калабарацыі скідваць з самалёта. Скінуць «баласт». Гэта іх тэрміналогія, палітыка і філасофія, якая апраўдвае такія жудасныя дзеянні. Мы таксама маглі б апынуцца тым самым «баластам». Так што, як кажуць, ідзі і глядзі на сапраўдную Еўропу, тую, што ўбачыў Элем Клімаў. Ідзі і глядзі праз тэлеграм нашага Дзяржпагранкамітэта на сённяшні Захад вачамі нашых пагранічнікаў, следчых і ўрачоў, што выязджаюць, калі зноў і зноў знаходзяць трупы, падкінутыя заходняй «цывілізацыяй». У Францыі ёсць Сент-Жэнеўеў-дэ-Буа — свайго роду магілкі мігрантаў, дзе пахаваны тыя, хто шукаў паратунку ад рэвалюцыі 1917-га. А ў нас будзе мартыралог мігрантаў, якія шукалі паратунку ад канфліктаў, развязаных заходняй «дэмакратыяй», і якіх яна ж закатавала. Заходнія гуманісты зноў скідваюць «баласт», але дарэмна — іх лодка ўсё роўна ідзе на дно.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Данія працягнула пагранічны кантроль на граніцы з Германіяй



Урад Даніі падоўжыў на шэсць месяцаў часовы кантроль на граніцы з Германіяй. Гэта зроблена з меркаванняў бяспекі, адзначыў міністр юстыцыі Петэр Хумельгор, паведаміў Euronews. Тэрмін дзеяння такой часовай меры павінен быў скончыцца ў маі. «Бяспека датчан з'яўляецца асноўным прыярытэтам урада. Паводле ацэнкі кабінета, цяперашняя карціна пагроз робіць неабходным захаванне часовага кантролю на граніцы з Германіяй», — растлумачыў Хумельгор. Міністр юстыцыі зазначыў, што пагранічны кантроль трэба разглядаць у святле таго факта, што тэрарыстычная пагроза «па-ранейшаму сур'ёзная і ўзмацняецца», сярод іншага — у выніку выпадкаў акцый са спальваннем рэлігійных кніг і канфлікту на Блізкім Усходзе. Летась Еўракамісія выказала занепакоенасць наконт заканнасці ўвядзення пагранічнага кантролю на працяглы тэрмін. Данія ўпершыню ўвяла пагранічны кантроль з Германіяй у пачатку 2016 года ў сувязі з крызісам з бежанцамі.

## МЗС Паўднёвай Карэі выказаў пратэст Японіі з-за астравоў Токта

Паўднёвая Карэя выказала пратэст Токіа з-за штогадовага даклада Міністэрства замежных спраў Японіі, у якім змяшчаліся «тэрытарыяльныя прэтэнзіі» на астравы Токта. Аб гэтым заявілі ў паўднёвакарэйскім знешнепалітычным ведамстве, паведаміла ТАСС. Паўднёвакарэйскі бок заклікаў спыніць падобныя дзеянні. «Сцвярджэнні японскага ўрада не акажуць ніякага ўплыву на наш суверэнітэт над астравамі. Працягнем рашуча рэагаваць на іх і надалей», — дадалі ў Сеуле. Як паведаміла агенцтва Yonhap, МЗС Рэспублікі Карэя таксама выклікала на гутарку дыпламата з японскага пасольства. Токта (Такэсіма) — гэта група невялікіх астравоў агульнай плошчай 0,188 кв. км, размешчаных на ўсход ад Карэйскага паўвострава. Гэтыя бязлюдныя скалістыя тэрыторыі сталі прадметам міжнароднай спрэчкі пасля 1945 года, калі Карэя была вызвалена ад японскага каланіяльнага панавання. Цяпер астравы кантралююцца Паўднёвай Карэяй.

# ЧАС МАЛАДЫХ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прычым аператыўна і падрабязна распісваецца кожны нюанс, звязаны з цэнтралізаваным экзаменам або тэсціраваннем. На мінулым тыдні, 9 красавіка, у агульны працэс уключыліся і «гарачыя лініі». Пра тое, наколькі там горача цяпер, расказвае **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ**.

— У ВНУ краіны ўжо працуе «гарачая лінія» тэлефона прыёмнай камісіі па пытаннях паступлення. Працаваць яна будзе да канца прыёмнай кампаніі ў 42 дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі і сямі прыватных — з 9.00 да 18.00 у будныя дні. Усе кантактныя тэлефоны і графік работы ёсць на сайце Мінадукацыі, інфармацыйных рэсурсах устаноў вышэйшай адукацыі. «Гарачая лінія» працуе тыдзень.

***— Ці шмат званкоў на яе ўжо паступіла?***

— Званкі ёсць, але назваць іх шквалам нельга. Гэта значыць толькі адно — інфармацыі, неабходнай для абітурыентаў на дадзеным этапе, дастаткова на сайце міністэрства, сайтах вышэйшых навучальных устаноў і каледжаў, тэлеграм-каналах і іншых інтэрнэт-рэсурсах. Усе навааўвядзенні ці навіны мы аператыўна даводзім да абітурыентаў, бацькоў, зацікаўленых асоб. У частцы інфармавання шырэйшага кола насельніцтва нам выдатна дапамагаюць рэспубліканскія, абласныя і раённыя СМІ. У выніку нейкіх заўваг ці скарг ад абітурыентаў аб тым, што мы не своечасова даводзім да іх неабходную інфармацыю, не паступала.

Тым не менш значная частка адказаў на пытанні, якія ёсць у тых, хто паступае па дадатковых траекторыях па спецыяльнасці, якую ён абраў, па ўнутраных уступных экзаменах, якія неабходна здаваць пры паступленні на пэўныя спецыяльнасці, па арганізацыі мэтавага прыёму, які таксама мае свае асаблівасці, і іншым даюць у асноўным «гарачыя лініі» ўстаноў адукацыі.

З гэтага года ў новым фармаце пачаў працаваць рэспубліканскі вэб сайт абітурыент.by. Мы яго кардынальна абнавілі. З'явіліся новыя рубрыкі, калькулятар для абітурыентаў, пры дапамозе якога яны могуць ацаніць свае магчымасці паступлення ў ВНУ з улікам прахаднога бала мінулага года. З'явіўся і спецыяльны раздзел для абітурыентаў — грамадзян Расійскай Федэрацыі, якія ў 2024-м змогуць паступаць на шэраг спецыяльнасцяў у нашы ВНУ на бюджэт па выніках адзінага дзяржаўнага экзамену.

***— Дзе яшчэ сёння могуць атрымаць адказы на свае пытанні абітурыенты?***

— Інфармацыйных мерапрыемстваў для іх праводзіцца нямала — у рамках дзён адкрытых дзвярэй, майстар-класаў, якія пастаянна праходзяць у нашых установах адукацыі. Там абітурыенты атрымліваюць вычарпальную інфармацыю аб самой установе, спецыяльнасцях, па якіх там рыхтуюць, асаблівасцях уступнай кампаніі і навучання.

У апошнія гады ВНУ і каледжы шырока выкарыстоўваюць практыку наведвання школ, гімназій, ліцэяў спецыялістамі, выкладчыкамі ВНУ і каледжаў. Тыя прыязджаюць непасрэдна да выпускнікоў і праводзяць інфармацыйную работу. Да яе актыўна падключаюцца і прадстаўнікі заказчыкаў кадраў, будучыя працадаўцы. Сёлета адзначаецца іх асабліва высокая актыўнасць — толькі ў Адзіны дзень адкрытых дзвярэй, які прайшоў у сакавіку, беларускія ВНУ наведала каля 900 прадстаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый нашай краіны.

Вялікі эфект дае і ўдзел у маштабных рэспубліканскіх мерапрыемствах, такіх як выстава «Адукацыя і кар'ера», на якой была прадстаўлена цэлая алея арганізацый — заказчыкаў кадраў разам з нашымі ўстановамі адукацыі. Такім чынам, абітурыенты, якія наведалі гэту выставу, змаглі даведацца не толькі пра тое, дзе яны могуць атрымаць тую ці іншую спецыяльнасць, але, што таксама вельмі важна, дзе з гэтай спецыяльнасцю можна ў далейшым працаўладкавацца і атрымаць першае рабочае месца. Хто хацеў пайсці далей, цікавіўся даляглядамі свайго прафесійнага росту і будучага развіцця. Пра што гэта гаворыць? Пра тое, што наймальнік разумее: пошук сваіх будучых работнікаў, кваліфікаваных і неабходных прадпрыемству кадраў, пачынаць трэба з абітурыентаў. Каб падабраць матываваных хлопцаў і дзяўчын, што прыходзілі б у каледж ці ўніверсітэт ужо з разуменнем таго, якія задачы, у тым ліку прафесійныя, давядзецца вырашаць пасля завяршэння вучобы. Хочацца адзначыць, што ў рамках такой работы і ў арганізацый, і ў абітурыентаў з'яўляецца дадатковая магчымасць заключаць дагаворы на мэтавую падрыхтоўку. Дарэчы, у апошнія гады гэта становіцца трэндам — колькасць дагавораў павялічваецца, і, думаю, гэты кірунак будзе развівацца далей.

***— Ці здараюцца званкі са скаргамі, прэтэнзіямі?***

— Такіх вельмі мала. Сёння ў нас створаны ўсе ўмовы для арганізацыі ўступнай кампаніі — празрыстыя і роўныя для ўсіх. І для тых, у тым ліку, хто паступае па дадатковых траекторыях: выдатнікі, пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд, выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка і ліцэяў пры ўстановах вышэйшай адукацыі, а таксама профільных класаў, дзе на працягу двух гадоў вывучаўся шэраг прадметаў на павышаным узроўні. Пры паступленні па такіх дадатковых траекторыях ёсць некалькі патрабаванняў: выдатная паспяховасць, рэкамендацыі педагагічнага калектыву. Разам з тым у 2024 годзе правіламі прыёму прадугледжана, што па ўсіх спецыяльнасцях, незалежна ад таго, якая колькасць бюджэтных месцаў выдзелена, застаецца не менш як 20 працэнтаў (для медыцынскіх — не менш як 10 працэнтаў) месцаў для паступлення абітурыентаў на агульных падставах.

Сёлета пашырыліся магчымасці і для выпускнікоў, якія скончылі школу з залатым або сярэбраным медалём, а каледж — з чырвоным дыпломам. У рэгіянальныя ВНУ практычна на ўсе спецыяльнасці яны могуць быць залічаны без уступных экзаменаў.

***— Хто звычайна дзяжурыць на «гарачай лініі»?***

— Абавязкова вопытныя работнікі з устаноў вышэйшай адукацыі. Пры неабходнасці падключаюцца спецыялісты міністэрства.

***— Што часцей за ўсё спрабуюць высветліць абаненты на тым канцы провада?***

— Асаблівасці арганізацыі правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і правілаў прыёму. Пытаюцца, як заключыць дагавор этавай падрыхтоўцы. Цікавяцца працэсам падліку балаў і ў цэлым тым, як адбываецца залічэнне. Часта просяць пракаментаваць сітуацыю па дадатковых траекторыях паступлення. Гэта значыць, задаюць канкрэтныя пытанні, якія цікавяць канкрэтнага абітурыента.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Сезонны інтарэс

# Набыць тур са зніжкай

## прапануюць на кірмашы «Адпачынак-2024»

**З 18 па 20 красавіка на канькабежным стадыёне культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-арэна» пройдзе 26-ы міжнародны вясенні кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2024». У ім возьмуць удзел больш чым 300 экспанентаў, у тым ліку прадставяць свой турыстычны патэнцыял усе 118 раёнаў Беларусі, а таксама 10 найбуйнейшых беларускіх гарадоў. Сярод удзельнікаў — і 27 рэгіёнаў Расіі, а таксама Турцыя, Куба і іншыя замежныя краіны. Арганізатары абяцаюць, што наведвальнікаў чакае шмат сюрпрызаў і прапаноў, у прыватнасці са зніжкамі можна набыць туры і паслугі. Таксама ў рамках мерапрыемства пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства».**









Як адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК**, выстаўка — гэта не толькі значнае турыстычнае, але і сацыяльна-культурнае, грамадскае, эканамічнае мерапрыемства.

— Яно ўнікальнае па некалькіх прычынах. Па-першае, выстаўка дарэчы перад пачаткам актыўнага турыстычнага сезона. Усе навінкі сезона абавязкова будуць прэзентаваны на форуме. Па-другое, гэта міжнароднае мерапрыемства, дзе пацвердзілі ўдзел 12 краін, за апошнія тры гады гэта рэкордная лічба. Па-трэцяе, гэта значнае дзелавое мерапрыемства са сваімі падзеямі ў розных фарматах: варкшопаў, канферэнцый, перамоў, прэзентацый, — расказаў Алег Андрэйчык.

Падчас мерапрыемства будзе працаваць пяць дзелавых пляцовак: дзве сцэнічныя і тры канферэнц-залы.

Але галоўнай «разынкай» мерапрыемства стане ўдзел усіх 118 раёнаў і дзесяці найбуйнейшых гарадоў, якія на працягу трох дзён у рэжыме нон-стоп прадэманструюць свае культурныя, гістарычныя, турыстычныя і гастранамічныя адметнасці. Дарэчы, упершыню (а выстаўка, нагадаем, праводзіцца 26-ы раз) яна не змагла змясціць усіх ахвотных на ранейшай пляцоўцы, і было прынята рашэнне пераехаць на «Мінск-арэну».

Дадаткова будуць праведзены дні абласцей: 18 красавіка свой турыстычны патэнцыял прэзентуюць Брэсцкая і Віцебская вобласці, 19-га — Магілёўшчына, Гродзеншчына і Гомельшчына, а 20-га — сталіца і Мінская вобласць. Яны будуць суправаджацца культурнай праграмай, розыгрышамі прызоў, да таго ж кожны рэгіён падрыхтаваў для гасцей адмысловыя сюрпрызы.

Свая праграма і ў дзелавой частцы выстаўкі: 18 красавіка раскажуць пра новыя праекты і лічбавыя прадукты, аб'екты і маршруты, 19 красавіка будзе прысвечаны дзелавому, прамысловаму, адукацыйнаму турызму, турыстычна-інфармацыйным цэнтрам, якія пачалі адкрывацца летась. У рамках выстаўкі пройдзе і другі расійска-беларускі турыстычны кангрэс, на якім будуць абмеркаваны пытанні тураператарскай дзейнасці, а таксама ўдзельнікі падзеляцца вопытам супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Расіі і Беларусі.

Сярод экспанентаў — 27 рэгіёнаў Расіі, што ў тры разы больш, чым летась. У іх уваходзяць Ніжагародская вобласць, Башкартастан, Дагестан, Карэлія, Чалябінская, Калінінградская, Смаленская, Уладзімірская вобласці, Санкт-Пецярбург. Дарэчы, Ніжагародская вобласць выступае генеральным партнёрам выстаўкі.

Сёння расійскі турыстычны рынак для Беларусі з'яўляецца самым значным і перспектыўным, дадаў Алег Андрэйчык. Ён прывёў лічбы, што ў 2019 годзе за межы Беларусі выязджала больш як мільён арганізаваных турыстаў. У 2023 годзе іх колькасць знізілася ў 2,5 раза — да 400 тысяч. Але значна павялічыўся лік турыстаў, якія падарожнічаюць па Беларусі (з 1300 тысяч у 2019-м да 1700 тысяч у 2023-м). Другі важны трэнд пасля падарожжаў унутры краіны — паездкі ў краіны СНД і найперш — Расію.

— За апошнія два-тры гады мы бачым штогод 50-працэнтнае павелічэнне плыні арганізаваных турыстаў у Расію і з Расіі да нас. Летась каля 250 тысяч беларусаў набылі ў туркампаній туры ў Расію. Па даных Белстата, нашу краіну летась наведала больш чым пяць мільёнаў расійскіх турыстаў, пры тым што ўсяго было пяць мільёнаў 800 тысяч турыстаў. Таму сёння — гэта асноўны кірунак, і ён развіваецца. Калі раней расіяне выбіралі Мінск, Віцебск і Брэст, то сёння любыя прапановы ўспрымаюцца пазітыўна. Гэта не толькі абласныя цэнтры, але і Полацк, Пінск і іншыя гарады, Белавежская пушча, Браслаўшчына, Налібоцкая пушча, нацыянальныя паркі. Бачым тэндэнцыю, што расіяне вяртаюцца, наведваючы ўсё новыя рэгіёны, — падкрэсліў Алег Андрэйчык.

У сваю чаргу, беларусы сталі актыўна асвойваць акрамя Масквы і Санкт-Пецярбурга і такія рэгіёны, як Каўказ, Цэнтральную Расію, Смаленскую, Бранскую і Пскоўскую вобласці. Ёсць цікавасць і да такіх краін, як Узбекістан, Казахстан, Азербайджан, Кыргызстан.

Дарэчы, сярод удзельнікаў форуму «Адпачынак-2024» — Узбекістан, Туркменістан, Палесціна, Куба, Турцыя, Кыргызстан.

— Цікавасць да выстаўкі штогод расце. Усё больш замежных калег і партнёраў наведвае мерапрыемства ў складзе дзелавых дэлегацый, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Сяргей БАРАН**.

Цікавым, але недаацэненым беларусамі напрамкам пакуль застаецца Індыя, улічваючы, што нацыянальны авіяперавозчык «Белавія» ажыццяўляе авіямаршрут з Мінска ў Нью-Дэлі. Разглядаецца адкрыццё новага авіямаршруту з Мінска на кітайскі востраў Хайнань (курортны горад Санья). Актыўна ў кірунку адкрыцця авіяпералётаў Мінспорту працуе з Кубай і Венесуэлай.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Прафесійна, аператыўна, па-добраму

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ ў канцы лютага па вуліцы Маякоўскага, 6 у абласным цэнтры адкрылася гарадская служба «адно акно». Тут аб'ядналіся адразу тры службы пад адпаведнай назвай — Брэсцкага гарвыканкама, а таксама Маскоўскай і Ленінскай адміністрацый. Наведвальнікаў прымаюць па адміністратыўных працэдурах незалежна ад таго, у якім раёне яны хочуць іх ажыццявіць. Зручнасць заключаецца ў тым, што па некалькіх адміністрацыйных працэдурах цяпер можна звярнуцца ў адно месца. Раней бывалі выпадкі, калі чалавеку даводзілася ісці ў гарвыканкам і раённую адміністрацыю — пытанне адносілася да кампетэнцыі розных дзяржаўных органаў. Цяпер неабходнасць перамяшчэнняў адпала.

Паводле інфармацыі начальніка службы Веры Бухта, адначасова яны прымаюць да 20 чалавек, для зручнасці зроблена электронная чарга. У будынку створана безбар'ернае асяроддзе, устаноўлены інтэрактыўны стэнд для інфармавання наведвальнікаў. Грамадзяне могуць чакаць сваю чаргу на зручных канапах, за столікам ёсць магчымасць аформіць патрэбны дакумент. Паклапаціліся і аб малых наведвальніках, якія прыходзяць разам з бацькамі. Для іх уладкаваны дзіцячы куток. Акрамя таго, зона чакання крыху аддзелена ад зоны прыёму, каб было камфортна і супрацоўнікам, і грамадзянам.

Часцей за ўсё людзі звяртаюцца па пытаннях жыллёвай палітыкі: пастаноўка на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, арэнднае жыллё, выдача даведак аб стане на ўліку тых, хто мае патрэбу. Людзі ідуць па дазвол на ўстаноўку кандыцыянераў на шматкватэрных жылых дамах, паставіць дзяцей у чаргу на атрыманне месца ў садку, па атрыманне дазволу на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і ўвод іх у эксплуатацыю. Суб'екты гаспадарання звяртаюцца па пытаннях архітэктуры і будаўніцтва, гандлю і грамадскага харчавання.

Яшчэ падчас адкрыцця семінара адзначалі, што практыка канцэнтрацыі службы «адно акно» ў краіне першая. За дзень сюды прыходзіць да 500 чалавек. Падчас семінара **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ** паведаміў, што будынак для службы падбіралі з улікам лагістыкі.

— У цэнтры Брэста было памяшканне, якое трэба было прыцягваць у гаспадарчы зварот. На ім і спынілі свой выбар найперш таму, што размешчана яно ў самым цэнтры горада. І ўжо цяпер можам канстатаваць, што аб'яднанне некалькіх службаў дало станоўчы эфект у справе прасоўвання электроннага дакументаабароту, магчымасці вырашэння шэрагу пытанняў у адным месцы. Цяпер не трэба хадзіць па розных інстанцыях. Мы назіраем дакладную адладжаную работу спецыялістаў. Былі дні, калі службу наведвалі 700—800 чалавек за дзень. Але работнікі справіліся і з такім наплывам. Наяўны штат супрацоўнікаў аптымальны. Работа з насельніцтвам — адна з асноўных на сёння. Ад спецыялістаў патрабуецца кампетэнтнасць, прыстойнасць, уважлівасць, каб выслухаць кожнага чалавека і аператыўна вырашыць яго праблему, — падсумаваў кіраўнік горада.



Пра важнасць службы ў справе дзяржаўнай і грамадскай бяспекі падрабязна гаварыў **Сяргей ХАМЕНКА**, які падчас правядзення семінара займаў пасаду міністра юстыцыі, а цяпер **абраны намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі**. Сваю думку Сяргей Мікалаевіч падмацаваў прыкладам: «Нейкі ўмоўны грамадзянін звярнуўся ў службу «адно акно». Яго ўважліва выслухалі, аператыўна вырашылі пытанне. Ён выходзіць з будынка з добрым настроем, ідзе дадому, дзеліцца гэтым настроем з жонкай, іншымі сямейнікамі, расказвае пра свой вопыт наведвання службы калегам на рабоце, таварышам па рыбалцы, суседзям па кватэры і гаражы. Ад названых людзей інфармацыя ідзе далей. Пры іншым раскладзе негатыўная ацэнка і адпаведны настрой таксама распаўсюджваюцца вельмі хутка. У кожнага патэнцыяльнага наведвальніка ёсць сваякі і знаёмыя. Такім чынам ствараецца недавер, які з'яўляецца складнікам сацыяльнай напружанасці. Такога ні ў якім разе нельга дапускаць».

Падкрэслівалася таксама, што для супрацоўнікаў названай службы недапушчальнай з'яўляецца парада тыпу: «Прайдзіце на трэці паверх у кабінет нумар...» Чалавек звярнуўся да спецыяліста і павінен атрымаць адказ на месцы.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення абавязковай юрыдычнай экспертызы нарматыўных прававых актаў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Валянціна ЯКІМОВІЧ** сказала, што семінар у Брэсце стаў добрай пляцоўкай для абмену вопытам работы службаў «адно акно»: «Мы ўбачылі, што асноўныя падыходы ў рабоце з насельніцтвам — гэта аператыўнасць, якасць і камфорт грамадзян пры атрыманні паслуг, у тым ліку пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур. Апошняе вельмі важна, супрацоўнік службы знаходзіцца на перадавой узаемадзеяння з грамадзянамі».

На семінары таксама абмеркавалі актуальныя карэкціроўкі заканадаўства і практычныя аспекты работы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота ZARYA.BY**

---

Падзея

# «Буйніцкае поле» — на дзве краіны

## У Саюзнай дзяржаве з'явілася новая літаратурная прэмія

**У Маскве на пляцоўцы Нацыянальнага павільёна Рэспублікі Беларусь на ВДНГ прайшлі Дні Магілёўскай вобласці. Яны падсумавалі тую грандыёзную работу, якая праводзіцца магілёўчанамі ў сферы інтэграцыйных стасункаў літаральна з усімі рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі.**

У выступленні і кіраўніка вобласці Анатоля Ісачанкі, і ганаровых гасцей урачыстага адкрыцця Дзён — Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Крутога, Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Дзмітрыя Мезенцава — гучалі лічбы, называліся ўражлівыя прыклады літаральна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Дасягненні сталі магчымымі і дзякуючы высокім урадавым рашэнням, пазіцыі нацыянальных лідараў нашых дзяржаў — Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Прыемна было слухаць і выступленне кіраўнікоў маладзёжных арганізацый Магілёўшчыны і цэлага шэрагу рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, якія пагаднены з магілёўскімі сябрамі ў правядзенні мерапрыемстваў па захаванні гістарычнай памяці, у супольнай рабоце беларускай і расійскай моладзі, студэнцтва па ўмацаванні духоўнасці нашай агульнай прасторы.

Асобнай падзеяй, якая стала выразнай праявай адзінства беларускай і расійскай культур, літаратур, праявай агульных ініцыятыў у захаванні і развіцці традыцый агульнай літаратурнай прасторы, можна лічыць і падпісанне Палажэння аб беларуска-расійскай літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле». Ініцыятыва невыпадковая. Яна нарадзілася летась, калі ў Магілёве праводзілася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя па гераіка-патрыятычным выхаванні «Гэта трэба — не мёртвым! Гэта трэба — жывым: Буйніцкае поле — поле памяці». Выступаючы на канферэнцыі, шырокі ўздел у якой прымалі і пісьменнікі з Расіі — старшыня агульнарасійскай грамадскай арганізацыі «Саюз пісьменнікаў Расіі» Мікалай Іваноў, дэлегацыі пісьменнікаў з Бранска і Смаленска, — старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка заўважыў: «...Менавіта тут у 1941 годзе ішлі цяжкія абарончыя баі, і праціўнік атрымаў годны адпор. 23 дні ў адным акопе змагаліся нашы з вамі землякі, ураджэнцы Магілёўскай, Смаленскай, Разанскай, Тульскай, Маскоўскай абласцей. Буйніцкае поле — сімвал агульнай памяці. Наш гістарычны гонар і боль за загінулых салдат, салдат-вызваліцеляў, якія выратавалі ўвесь свет ад фашызму. Гэта месца гераічнага подзвігу савецкага народа, якое па праве стаіць у адным шэрагу з Кулікоўскай, Барадзінскай, Прохараўскай бітвамі і бітвай пад Ржэвам... І гэта святы абавязак кожнага з нас: зрабіць усё магчымае, каб увекавечыць памяць пра подзвіг нашых брацкіх народаў».



Якраз тады, на пачатку 2023 года, на канферэнцыі ў Магілёве кіраўнік расійскай пісьменніцкай арганізацыі Мікалай Іваноў і выступіў з ініцыятывай заснаваць літаратурную прэмію «Буйніцкае поле»... «У нас, у Расіі, ёсць прэміі, прысвечаныя знакамітым адрасам гістарычнай памяці, — Кулікову полю, Барадзінскаму полю, Прохараўскаму полю, — зазначыў Мікалай Фёдаравіч. — Дарэчы, шмат хто з беларускіх літаратараў стаў лаўрэатам прэміі «Прохараўскае поле». Сярод іх — і пісьменнік-франтавік, беларускі партызан Алесь Савіцкі... Чаму б нам не заснаваць супольную беларуска-расійскую літаратурную прэмію «Буйніцкае поле»?» Ініцыятыву падтрымаў і Анатоль Ісачанка. На канферэнцыі, у яе кулуарах шмат гаварылася пра Канстанціна Сіманава, выключную ролю вялікага рускага і савецкага пісьменніка, чый прах развеяны над Буйніцкім полем, у стварэнні мастацкага, дакументальнага партрэта баёў на подступах да Магілёва ў 1941 годзе... Невыпадкова добрай традыцыяй на працягу многіх гадоў з'яўляецца правядзенне ў Магілёве дзён «Сіманаўскіх чытанняў»...

Прайшоў год — і ў Маскве адбылося падпісанне Палажэння аб літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле», заснавальнікамі якой з'яўляюцца Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», агульнарасійская грамадская арганізацыя «Саюз пісьменнікаў Расіі». Свае подпісы паставілі старшыня СП Беларусі Алесь Карлюкевіч і старшыня СП Расіі Мікалай Іваноў.

Ідэя заснавання новай прэміі заключаецца ў падтрымцы сучаснага літаратурнага працэсу ў Саюзнай дзяржаве і заахвочвання таленавітых аўтараў, якія развіваюць найлепшыя традыцыі паэзіі, прозы і драматургіі, ствараюць творы высокага грамадзянскага гучання. Асноўнымі патрабаваннямі да намінантаў з'яўляюцца бясспрэчны мастацкія вартасці твораў, вастрыня і актуальнасць праблематыкі, глыбіня асэнсавання значных для сучаснага грамадства пытанняў. Прэмія будзе прысуджацца штогод у рамках міжнароднай канферэнцыі «Гэта трэба — не мёртвым! Гэта трэба — жывым: Буйніцкае поле — поле памяці».

...Магілёўшчына ва ўсе пасляваенныя дзесяцігоддзі падтрымлівала гераіка-патрыятычную, ваенную тэму ў беларускай літаратуры. Гэта навідавоку. Яркі прыклад — творчасць паэта Аляксея Пысіна (1920—1981). Гэта ён, «салдат і сейбіт», пісаў пра сябе: *«Удалося і мне жалезу // Мігам надзяліць ненажавым. // З той мяжы нябліскай я належу // Ў пэўнай меры — не адным жывым...»* Так у вершы «Цёзкі, сваякі...», як засведчыла беларуская крытыка, «Аляксей Пысін акрэсліў адзін з асноўных маральна-этычных крытэрыяў — памяць «пабрацімства мёртвых і жывых»... Гэтыя неўміручыя радкі таксама належаць Пысіну: *«Палім мы маршанскую махорку, // Бачым мы Дняпроўскую граду. // Будзе сёння бой. На тым узгорку // Можа, я таксама ўпаду»*. І яшчэ — ад Пысіна, з яго «Балады Буйніцкага поля», як запавет нам, жывым: *«За полем поле, як за словам слова // У спеве аб свяшчэнным, дарагім. // Ёсць Барадзінскае, ёсць Кулікова, // І — гэтае, вядомае не ўсім. // О, поле бою, Буйніцкае поле, // Дарога, дрэўцы, ўскрайчык травяны, // З трывогаю, з сваім глыбінным болем // Ты ўсё яшчэ вяртаешся з вайны. // <...> Даўно пярэдні край жніва не дзеліць, // Ды бой жыве, стралковы полк жыве. // Варожых танкаў колькі!.. // Трыццаць дзевяць // Старчма гарэць на горасным жніве. // Знікаюць дрэвы, птушкі палявыя, // Дняпром сплывае плач маладзіка. // «Мы будзем тут стаяць, пакуль жывыя», — // Сказаў Куцепаў, камандзір палка. <...> О, поле бою, Буйніцкае поле, // Вясною, летам, восенню сырой // Выносіш ты ў разгорнутым прыполе // Мінулае — з каменнем і жарствой. // Перад дарогаю пад гул матораў // Скаціўся з поля камень, а на ім // Той самы подпіс — франтавы аўтограф // Палку Куцепава і нам, жывым. // Спыніцеся, мой боль, мой смутак, — пастаім»*.

І сёння ў пісьменніцкай кагорце Магілёўшчыны — руплівыя захавальнікі памяці пра Вялікую Айчынную: паэт Алесь Казека, публіцыст Мікалай Барысенка, публіцыст, краязнавец Віктар Арцем'еў, паэт Уладзімір Ясеў... Дзякуючы іх літаратурнай, грамадскай руплівасці Буйніцкае поле і надалей застаецца мастацкім сімвалам вечнай гераічнай памяці...

А заснаванне літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле» — гэта яшчэ і напамін пра іншыя памятныя мясціны Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі; падказка, што следам варта заснаваць, напрыклад, і міжнародную літаратурную прэмію «Брэсцкая крэпасць». Будзем спадзявацца, што прыклад магілёўчан падтурхне да гэтага і берасцейскіх літаратараў... Памяць пра нашых прашчураў, якія гераічна адстойвалі і нашу свабоду ад фашысцкай няволі, ад генацыду, — аснова духоўнага сталення грамадства і ў наступныя часіны. Забываць на гэта мы не маем права!..

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Сямейная газета

Выпуск № 7 (232)

Думкі ўслых

# Шлях з ракушак



*Сябры нашай сям'і дабудавалі дом на ўскрайку раённага цэнтра і пераехалі туды жыць са здымнай кватэры. З суседзямі справа, кажуць, жывуць душа ў душу. Калі тыя з'язджаюць на адпачынак, прыглядаюць за іх коцікам, і наадварот. Сусед жа злева — мясцовы бізнесмен — нядаўна паказаў сябе, мякка кажучы, не з самага лепшага боку.*

Зусім выпадкова высветлілася, што ён, агароджваючы свой катэдж, самавольна захапіў кавалак суседскай зямлі. Пра гэта ніхто б, магчыма, і не даведаўся, калі б не геадэзічны квадракоптар, які запусцілі мясцовыя ўлады, каб праверыць адпаведнасць граніц участкаў. Зафіксаваўшы парушэнне, яны даслалі бізнесмену ліст з просьбай у вызначаныя тэрміны вырашыць праблему. Мужчына, замест таго, каб выбачыцца і паспрабаваць неяк дамовіцца, прыйшоў да новых суседзяў з наездам і паперкай. Маўляў, падпішыце: вы не супраць, што я за свае грошы ўстанавіў такую шыкоўную агароджу паміж нашымі ўчасткамі. «Мы сказалі, што пакуль не будзем нічога падпісваць. І самі патэлефанавалі ў зямельную службу. Там патлумачылі, што гаворка ідзе не пра паўметры, як сцвярджаў сусед, а пра цэлых паўтара, і што мы маем поўнае права прымусіць парушальніка перанесці тую агароджу».

Сябры, веруючыя людзі, наўрад ці будуць з-за палоскі зямлі псаваць адносіны, нажываць сабе ворага на ўсё жыццё. Як мудра сказала Алеся, усім зямлі ў канцы жыцця хопіць. Разам з тым яны проста па-чалавечы не могуць зразумець, як так можна?..

На днях па парадзе сямейнага псіхолага Яўгена Ісачанкі (дзядзі Жэні) паглядзела два кароценькія мультфільмы. У першым галоўны герой — малады мужчына, уладальнік некалькіх прыбытковых прадпрыемстваў. Ён з усмешкай на твары ператварае слана ў піяніна, дрэва — у паперу, топча багоўку, якая трапілася на яго шляху, страляе ў мядзведзіцу, а яе дзіця — маленькае медзведзяня — садзіць у клетку на пацеху іншым. На першы погляд паспяховы, знаходлівы, разумны. Але пры гэтым жорсткі і бессардэчны... Другі мульцік — пра мужчыну, які паўсюль ходзіць са сваім любімым сабачкам. Неяк раніцай прачнуўся, а на яго пачала сварыцца жонка. Мужчына моўчкі прыцісну ў каханую да сябе і цярпліва чакаў, пакуль яна выпусціць сваю злосць і абдыме яго ў адказ. Потым ішоў па вуліцы, дзе ўсе сварыліся і крычалі. Ён не праходзіў міма, усім дапамагаў, абдымаў, супакойваў. І быў па-свойму шчаслівы.

Вы б хацелі, каб на каго з гэтых герояў праз дваццаць гадоў стаў падобны ваш сын? Гэта пытанне варта задаць сабе ўсім мамам і татам без выключэння, і чым раней, тым лепш, сцвярджае псіхолаг. Бо менавіта ад бацькоў у многім залежыць, якія якасці будуць закладзены ў дзецях з маленства.

Але вельмі часта мы хочам адно, а робім іншае, адзначыў дзядзя Жэня падчас свайго чарговага адкрытага ўрока і прывёў прыклад са школай. Хлопец атрымлівае добрыя адзнакі ўмоўна па дзесяці гуманітарных прадметах, астатніх дзесяць яму даюцца крыху горш — у тым ліку матэматыка, хімія, фізіка... Але бацькі лічаць, што сын павінен прынесіць выдатныя адзнакі абсалютна па ўсіх прадметах. Інакш не быць яму паспяховым у жыцці. І наймаюць рэпетытараў. Хлопец увесь вольны час карпее над падручнікамі і падцягвае тыя прадметы. Але пры гэтым ён чамусьці стаў менш усміхацца, здароўе пагоршылася, не стала сяброў. Як можна прывіць сыну эмпатыю, навучыць яго суперажываць, калі мы самі не звяртаем увагі на яго сапраўдныя жаданні, схільнасці, памкненні душы?

Яшчэ псіхолаг параіў пераглядзець сям'ёй фільмы «У пошуках Нэма» і «У пошуках Доры». Калі рыбка Доры была маленькай, то жыла, як і ўсе, з бацькамі. Да таго часу, пакуль не здарылася няшчасце і яе не ўцягнула ў трубу... Шмат гадоў рыбка шукала сваіх бацькоў у вялізным акіяне. У нейкі момант ёй стала страшна, бо яна не ведала, што рабіць далей. А потым супакоілася, агледзелася... І што? «Тут адна вада. А вунь там водарасці. Яшчэ водарасці... і ракушкі. Яны ўказваюць туды...» Як толькі Доры ўбачыла ракушкі, адразу ж згадала, што ў дзяцінстве вельмі любіла іх збіраць. Яна паплыла ўздоўж сцяжынкі з ракушак і... ўрэшце ўбачыла сваіх бацькоў. Аказваецца, калі Доры згубілася, яны штодня выкладвалі на дне акіяна ракушкі за ракушкай, шчыра верачы, што дачка іх знойдзе. Так і мы, бацькі, сваімі словамі, дзеяннямі, уласнымі ўчынкамі ствараем для дзяцей «ракушкі»-арыенціры ў жыцці, каб у самы цяжкі момант яны не збочылі з правільнага шляху, зрабілі правільны выбар. І нават калі б раптам аступіліся, то не пабаяліся прызнаць сваю памылку і захавалі людскасць у любой сітуацыі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

Тамара РАМАНЬКОВА:

# «Нават праз 40 гадоў сямейнага жыцця рамантыка застаецца...»

**У інтэрв'ю да свайго юбілею алімпійскі чэмпіён па фехтаванні Аляксандр Раманькоў на пытанне «У якім статусе вам камфортней за ўсё?» адказаў па-мужчынску: «У статусе мужа маёй жонкі». У гэтым статусе ён камфортна сябе адчувае ўжо 40 гадоў, ці, як кажа сам, «усё жыццё». За гэты час Аляксандр Раманькоў выйграў Алімпійскія гульні і яшчэ шэраг важных міжнародных стартаў, трэніраваў спартсменаў у розных краінах свету, узначальваў Беларускую федэрацыю фехтавання і рабіў шмат чаго яшчэ. Падзеі былі розныя, але заўсёды побач з чэмпіёнам была жонка Тамара, якая сваім прыкладам даказала, што тэорыя «за кожным вялікім мужчынам стаіць вялікая жанчына» хоць і банальная, але ўсё ж праўдзівая. 40 гадоў — гэтае цэлае жыццё, якое, як калейдаскоп, рознакаляровае. Для «Сямейнай газеты» пара Раманьковых падзялілася некаторымі элементамі свайго сямейнага калейдаскопа.**

## Элемент першы. Спорт

Тамара Раманькова (але тады яшчэ Сянько) — майстар спорту міжнароднага класа па кулявой стральбе. Як і многія савецкія дзеці, у спорт прыйшла выпадкова: трэнер Аляксандр Маісееў, ён жа сябар сям'і, прапанаваў запісацца ў секцыю. «Прыйшла, пастраляла, так і засталася. На першых спаборніцтвах была другой з канца. Сама сабе сказала: «Чаму іншыя могуць быць першымі, а я — не?». І стала так сур'ёзна трэніравацца, што дайшла да зборнай Савецкага Саюза. Я не магу сказаць, што была бліскучай спартсменкай, але і апошняй на спаборніцтвах больш не была», — успамінае Тамара Віктараўна.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*



Вы прасілі расказаць

# ЦІ ЗАЛЕЖАЦЬ ДЭКРЭТНЫЯ АД ЗАРОБКУ?

**НАША чытачка Вольга Аляксандраўна з Гродна пацікавілася, як зменяцца выплаты па цяжарнасці і родах у сувязі са зменамі ў выплаце бальнічных, якія пачнуць дзейнічаць з 1 ліпеня бягучага года, а таксама ці залежаць дэкрэтныя выплаты ад заробку жанчыны.**

Так, дапамога па цяжарнасці і родах, якая выплачваецца за 126 дзён (пры ўскладненых родах — 140 дзён), налічваецца ў залежнасці ад сярэднядзённага заробку. Пасля жанчына атрымлівае дзяржаўную дапамогу ў сувязі з нараджэннем першага ці наступнага дзяцей, а таксама дзяржаўную дапамогу па доглядзе дзіцяці.

Як расказала **намеснік кіраўніка Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына ЛІХАЧОВА,** дапамога па цяжарнасці і родах разлічваецца на тых жа падставах, што і для астатніх атрымальнікаў дапамогі па непрацаздольнасці. Праўда, у цяжарных жанчын усё ж ёсць пэўная льгота: з першага дня бальнічны разлічваецца ў памеры 100 %, і гэта норма захаваецца з 1 ліпеня бягучага года. Гэтак жа, як і цяпер, яна не будзе прывязаная да стажу.

## Каму і калі прызначаецца?

На дапамогу па цяжарнасці і родах могуць разлічваць работнікі (служачыя); асобы, якія самастойна ажыццяўляюць дзейнасць (індывідуальны прадпрымальнік, адвакат, натарыус) пры ўмове выплаты ўзносаў у ФСАН; асобы, якія выконваюць работы па грамадзянска-прававых дагаворах; навучэнцы дзённай формы атрымання адукацыі (прафесійна-тэхнічная, сярэдняя спецыяльная, вышэйшая або адукацыя пасля ВНУ), а таксама тыя, хто атрымаў такую адукацыю, — на працягу двух месяцаў пасля яе атрымання; асобы, якія праходзяць падрыхтоўку ў рэзідэнтуры ў вочнай форме; зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных.

Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца з 30 тыдняў цяжарнасці на 126 каляндарных дзён. У выпадку ўскладненых родаў, у тым ліку нараджэння дваіх і больш дзяцей, — на 140 каляндарных дзён. Жанчынам, якія пастаянна (пераважна) пражываюць і (або) працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, — з 27 тыдняў цяжарнасці на 146 каляндарных дзён, у выпадку ўскладненых родаў, у тым ліку нараджэння двух і больш дзяцей, — на 160 каляндарных дзён.

## Як атрымаць?

Прад'явіць лісток непрацаздольнасці: работнікам (служачым) — па месцы працы (службы); тым, хто самастойна ажыццяўляе дзейнасць, — у орган ФСАН па месцы рэгістрацыі; навучэнцам — па месцы навучання; зарэгістраваным у якасці беспрацоўных — у службу занятасці па месцы рэгістрацыі.

Звярнуцца па дапамогу варта не пазней за шэсць месяцаў з першага дня вызвалення ад працы згодна з бальнічным.

## Калі і куды звяртацца па дапамогу па доглядзе дзіцяці да трох гадоў

Па такі від дапамогі трэба звяртацца не пазней чым за 6 месяцаў з дня, наступнага за днём заканчэння перыяду бальнічнага па цяжарнасці і родах, у выпадку, калі выплачвана дапамога па цяжарнасці і родах. Калі ж яна не выплачвалася, то не пазней чым за 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення) дзіцяці (устанаўлення апекі). Калі дакументы прадстаўлены праз 6 месяцаў, дапамога прызначаецца з дня звароту па яе.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# РАДАСЦЬ ДАРЫЦЬ,

## або Як бабуля захапіла сваю ўнучку вышыўкай ікон

**Любоў да вышыўкі Настасся Якубовіч убірала ў сябе з дзяцінства. Прыязджаючы на канікулы да сваёй бабулі ў Баранавічы, назірала, з якім імпэтам тая «вымалёўвае» кожны новы крыжык, і сама не заўважыла, як захапілася. 85-гадовая Ніна Іванаўна зараз вышывае пераважна абразы, у Настачкі ж душа горнецца да традыцыйнага беларускага арнаменту, якім дзяўчына ў вольны час аздабляе ручнікі, сурвэткі, іншыя прадметы хатняга ўжытку. Ёсць у бабулі з унучкай і сумесная работа...**



### Пра блаславенне ды цудоўнае выратаванне

Нават калі б Ніна Іванаўна сціпла прамаўчала пра свае работы, не заўважыць іх у кватэры жанчыны немагчыма. Вышытыя крыжыкам і гладдзю абрусы, сурвэткі, ручнікі, абразы Божай Маці, Мікалая Цудатворца, святога Георгія Пераможцы ляжаць і вісяць на самых ганаровых месцах.

***— Як так атрымалася, што вы пачалі вышываць менавіта абразы?***

— Як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло… У мяне два сыны. Адзін памёр вельмі маладым, у 31 год. Вярнуўся з работы дадому, сеў за стол есці і сэрца раптоўна спынілася. Не ведала, як такое гора перажыць, як справіцца з болем, куды



сябе падзець. Днём і ноччу плакала. Дайшло да таго, што ледзь не пасябравала з гора з бутэлькай, але Бог уратаваў. Памятаю, неяк хадзіла па рынку, а там жанчына прадавала схемы для вышыўкі. Мне ў вочы кінулася менавіта Божая Маці з Ісусам на руках. Спынілася і глядзела на тую схему як зачараваная. Пасля разгаварыліся з прадаўшчыцай, і яна, даведаўшыся пра мой душэўны боль, параіла пачаць вышываць абразы. Маўляў, вышыўка будзе заспакойваць нервы і хоць на нейкі час дапаможа забыцца на сваё гора. Перад тым як пачаць, схадзіла ў царкву і папрасіла на гэта блаславення ў святара. І, ведаеце, здарыўся цуд — я нарэшце ўбачыла прамень у канцы тунэля...

Многія людзі прасілі Ніну Іванаўну вышыць для іх абраз з выявай канкрэтнага святога. Жанчына вышывала з радасцю, грошы не брала.

Але перажыванні ўсё ж, відаць, адыгралі сваю ролю, і пасля страты сына ў жанчыны выявілі анкалогію.

— Калі я ляжала ў анкалагічным цэнтры, мне вельмі хацелася вышываць. Але чамусьці думала, што на мяне за гэта будуць сварыцца, маўляў, стэрыльныя ўмовы, а яна тут са сваімі ніткамі. Таму нейкі час хавала канву ад урачоў. Калі доктар гэта ўбачыў, сказаў: «Навошта хаваеце? Вы, наадварот, сваім прыкладам заахвочвайце людзей. Няхай і яны чымсьці займаюцца, каб не канцэнтравацца толькі на хваробе».

За час знаходжання ў бальніцы Ніна Іванаўна паспела вышыць абраз і падчас выпіскі падарыла яго анкалагічнаму цэнтру.

***— Ці верыце вы ў цуды?***

— А як жа! Я ж толькі дзякуючы цуду засталася жывой. Калі немцы вялі нас у хлеў, каб спаліць, мне было ўсяго чатыры гадкі. Пакуль ішлі, бабуля мяне вучыла: «Калі будуць страляць, ты хавайся за мяне». Яны хацелі спаліць нашу вёску, але штосьці ім перашкодзіла... Цудам лічу і тое, што мая малодшая ўнучка захапілася вышыўкай. Перакanana: любая бабуля на маім месцы была б шчаслівая, калі б хтосьці працягнуў яе справу. Вышыванне патрабуе вялікай уседлівасці і цярплівасці. Над адной работай часам трэба карпець месяцамі.

— У нас з бабуляй, дарэчы, ёсць адна сумесная работа, — кажа Настасся. — Калі я вучылася ў 11 класе, пачала вышываць абраз Мікалая Цудатворца. Але паспела вышыць толькі палову, бо падрыхтоўка да паступлення займала практычна ўвесь мой час. Бабуля бачыла гэта, таму і прапанавала сваю дапамогу, бо абраз не павінен ляжаць незавершаным, нядобра гэта. Цяпер ён вісіць у мяне дома.

### Пра анёлаў-ахоўнікаў ды чыстыя намеры

У працоўным кабінеце Настассі вісяць выявы анёлаў-ахоўнікаў, вышытыя бабуляй.

— Я, як толькі прыйшла на работу, адразу іх прынесла сюды, каб яны мяне ахоўвалі, — усміхаецца дзяўчына.

Настасся працуе ў Навасельскім дзіцячым садку. Вельмі любіць сваю работу і ўкладае ў яе душу. Але і на сваё захапленне вышыўкай не забываецца, з задавальненнем праводзіць майстар-класы для калег, дзетак і іх бацькоў. Дашкольнікам па тэхніцы бяспекі нельга даваць у рукі звычайную іголку, дык Настасся Іванаўна прыдумала іншы спосаб, як вучыць іх вышываць: падрыхтавала пластмасавыя квадраты з дзірачкамі і пластмасавыя іголкі. Падчас фестывалю «Я пазнаю свет» яна праводзіла майстар-клас па вышыўцы і загадзя прадумала для ўсіх удзельнікаў падарункі — духмяныя мяшочкі, напоўненыя пахучымі зёлкамі. Зрабіла іх больш за семдзесят і на кожным вышыла нейкі сімвал з азбукі беларускага арнаменту.

— Мне падабаецца, калі элементы беларускай народнай культуры прасочваюцца ў сучасных рэчах, — кажа Настасся. — Няхай гэта будзе брошка, закладка, сумка, майка, аздобленыя вышыўкай, —



галоўнае, каб людзі карысталіся гэтым у штодзённым жыцці.

Для Настассі бабуля — дарадца, памочнік і настаўнік. Менавіта па ініцыятыве дзяўчыны ў музеі дзіцячага садка праходзіць выстава работ Ніны Іванаўны «Бабуліна казка». І ўжо вялікую іх колькасць унучка раздарыла наведвальнікам. Кажа, бабуля толькі радуецца гэтаму.

**Перад тым як пачаць, схадзіла ў царкву і папрасіла на гэта блаславення ў святара. І, ведаеце, здарыўся цуд — я нарэшце ўбачыла прамень у канцы тунэля...**

...Вышывае Ніна Іванаўна ўжо гадоў семдзесят. Згадвае, як пасля школы ішлі з сёстрамі складваць сена. Дык яна з сабой на поле брала канву, хавала яе пад кашулю. І як толькі з'ўлялася вольная хвілінка, вышывала.

— Я ж дзіця ваеннай пары, а пасля гора, што яна прынесла, усім хацелася зрабіць сваё жыццё больш светлым, радасным. Вышыўкай упрыгожвалі ручнікі, абрусы, сурвэткі, фіранкі на вокны, навалачкі, накідкі на падушкі, прадметы адзення... Прыйдзе свята, у хаце прыбярэш — і нібы сонца зайграе! Цяпер добра, можна купіць для рукадзелля ўсё, што пажадаеш. А раней ніткі мулінэ былі сапраўдным скарбам.

Да Ніны Іванаўны часам звяртаюцца з просьбамі вышыць не толькі абразы, але і вясельныя ручнікі. Майстрыца аздабляе іх кветкамі — сімвалам жаночага шчасця, парай галубкоў — сімвалам кахання і вернасці ў шлюбе... Брацца за такую працу можна толькі з чыстымі намерамі, у думках жадаючы шчасця маладым. Ніна Іванаўна перакананa, што энергетыка таго, хто вышывае, застаецца на прадмеце.

### Пра вясельны пасаг ды добрую памяць

— Бабуля стараецца штосьці вышыць кожнаму ўнуку, — кажа Настасся. — Калі жаніліся мае браты, яна прэзентавала ім па наборы вясельных ручнікоў. Яны захоўваюць іх дома як сямейную рэліквію. Нядаўна бабулечка і мне пасаг падрыхтавала. Вось гэты ручнік з крыжамі — для складзеня (складнога парнага абраза), такімі звычайна бацькі бласлаўляюць маладых, а гэты — для вясельнага каравая. Сказала, што, пакуль вышывала, малілася, каб я знайшла сабе добрага мужа.

Ніна Іванаўна прызналася, што без вышыўкі не ўяўляе жыцця.

— Бывае, пайду ў горад, стамлюся. Думаю, вярнуся, паляжу, адпачну. Аж не, прыходжу і саджуся вышываць. І стому як рукой здымае.

— Бабуля вышывае штодзень, акрамя нядзелі ды вялікіх святаў. Калі тэлефаную ёй у выхадны дзень, кажа: «Хутчэй бы заўтра, каб сесці вышываць». Бабуля жыве адна. Бацькі запрашалі, каб пераехала да іх у вёску. Але ж яна не пагаджаецца, кажа, што ў сваёй кватэры і сцены грэюць. Многія пажылыя людзі, калі застаюцца адны, не ведаюць, чым сябе заняць, таму ў галаву лезуць дрэнныя думкі. Бабуля часта паўтарае: «Калі б не вышыўка, наўрад ці я б столькі пражыла».

— Не люблю складзіраваць сваю вышыўку, — усміхаецца Ніна Іванаўна. — Хочацца, каб яна радавала іншых. Таму, калі збіраецца ўся радня, заўсёды прапаноўваю моладзі ўзяць тое, што падабаецца. Няхай у іх застанецца добрая памяць пра мяне.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара і з сямейнага архіва герaінь артыкула.**

# ЦІ ЗАЛЕЖАЦЬ ДЭКРЭТНЫЯ АД ЗАРОБКУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Дапамога прызначаецца з дня, наступнага за днём заканчэння перыяду выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах, ці з дня нараджэння (усынаўлення) дзіцяці (устанаўлення апекі) у выпадку, калі не выплачвалася дапамога па цяжарнасці і родах.

Па яе прызначэнне трэба звяртацца па месцы працы, службы, вучобы, клінічнай ардынатуры маці (мачахі) у поўнай сям'і, аднаго з бацькоў у няпоўнай сям'і, усынавіцеля, апекуна. Калі ў поўнай сям'і маці (мачаха) не працуе, не служыць, не навучаецца, не праходзіць клінічную ардынатуру і не з'яўляецца ІП або іншай асобай, якая самастойна выплачвае страхавыя ўзносы ў ФСАН, — па месцы працы, службы, вучобы, клінічнай ардынатуры бацькі (айчыма).

У іншых выпадках, а таксама, калі бацькі працуюць у мікраарганізацыях з колькасцю работнікаў да 15 чалавек або ў ІП, — у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы рэгістрацыі. У поўнай сям'і дапамогі прызначаюцца маці (мачасе) па месцы яе рэгістрацыі.

### Колькі складае дапамога?

З 1 лютага да 30 красавіка бягучага года ўстаноўлены наступныя памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці (аднаразовая) пры нараджэнні першага дзіцяці складае 10 БПМ, або 4067,40 рубля. Пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ, або 5694,36 рубля.

Дадатковая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (аднаразовая), складае 100 % БПМ, або 406,74 рублёў.

З 1 лютага да 31 ліпеня 2024 г. памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў складаюць на першае дзіця — 724,85 рубля, на другога і наступных дзяцей — 828,40 рубля, на дзіця-інваліда — 931,95 рубля.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «Нават праз 40 гадоў сямейнага жыцця рамантыка застаецца...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

«Я, дарэчы, таксама на сваіх першых спаборніцтвах быў апошнім. Лёс», — дадае Аляксандр Анатольевіч.

Пазнаёміліся яны, як няцяжка здагадацца, дзякуючы спорту. Аднаго дня ў Школу вышэйшага спартыўнага майстэрства, дзе Аляксандр Раманькоў, да таго часу ўжо алімпійскі прызёр і прызнаны найлепшы фехтавальшчык, быў у дзяўчат нарасхват, Тамара Сянько зайшла забраць талоны на харчаванне. «Зайшла такая німфа з касой да пояса, і я адразу падумаў, што такія ўжо замужам», — успамінае Аляксандр Анатольевіч. Але яна аказалася пакуль не замужам.

«Я пачырванела, збялела, забрала свае талоны і пайшла. А ён мяне дагнаў, праводзіў да прыпынку, пасадзіў на аўтобус (хоць сам быў на машыне). Ну, я з'ехала і забылася. І пачалася чарада «выпадковых Сустрэч»: то зноў у Школе вышэйшага спартыўнага майстэрства, то на спаборніцтвах», — успамінае Тамара Раманькова.



**«Калі ён выступаў у Сеуле, я думала, пасівею. Глядзела Алімпійскія гульні і баялася, каб у мяне сэрца не выскачыла».**

«Ага, выпадковых. Выпытваў ва ўсёй каманды стралкоў, якія ў яе планы, дзе яна будзе выступаць, якія ў яе спаборніцтвы», — дадае Аляксандр Раманькоў. Сустрэчы былі настолькі «выпадковымі», што для таго, каб даведацца адрас дзяўчыны, вядомаму спартсмену прыйшлося звярнуцца ў Дзяржкамспорт і нават сілавыя структуры.

«Пасля спаборніцтваў у Маскве, куды Саша прыехаў мяне падтрымаць, я з'ехала да бацькоў у Мар'іну Горку. Спакойна сяджу дома. Выпадкова гляджу ў акно і бачу, як у двары мой тата размаўляе з Сашам. Я ў шоку, тата яшчэ ў большым шоку. І толькі Саша задаволены стаіць з пакетам апельсінаў», — успамінае Тамара Віктараўна. Так «чыста выпадкова» і ўтварылася сям'я, дзе муж умее абыходзіцца з халоднай зброяй, а жонка добра страляе. Менавіта таму, як яны жартуюць, і жывуць 40 гадоў душа ў душу. Жарты і выдатнае пачуццё гумару, дарэчы, — яшчэ адзін элемент іх сямейнага калейдаскопа. «Калі перад вяселлем мы прыехалі ў сваты да бацькоў Томы, яе тата адвёў мяне ў бок. У мяне душа ў пяткі сышла. А ён абсалютна сур'ёзным тонам заяўляе: «Саша, я хачу сказаць табе праўду: Тома зусім не ўмее гатаваць ежу». Але мяне тады гэта зусім не хвалявала», — гаворыць Аляксандр Анатольевіч. І дадае, што сёння жонка гатуе выдатна.

## Элемент другі. Лёс

Быў у гісторыі гэтай пары выпадак, калі абсалютна апраўдана можна ўсклікнуць: гэта лёс!

«Прыехалі ў адпачынак да бацькоў Томы. Цешча папрасіла пачысціць, пафарбаваць дах дома. Няўжо цешчы можна адмовіць? Я працаваў на даху і адпачываў на гарышчы, каб не спускацца часта. Падымаю галаву — а паміж бэлькай і дахам ляжаць дзве складзеныя газеты. Адзін нумар «Фізкультурніка Беларусі» за 1974 год і другі нумар гэтай жа газеты за 1977 год. Здавалася б, нічога незвычайнага. Але на першых старонках гэтых газет — мая фатаграфія са спаборніцтваў, дзе я, як звычайна, перамог. Вось як дзве газеты з розніцай выхаду ў тры гады маглі апынуцца разам на адной бэльцы? Томін дзед, які іх туды паклаў, нібы ўсё ведаў. Усё ведаў дзед», — распавядае Аляксандр Анатольевіч. І як тут не паверыць у лёс?

## Элемент трэці. Падтрымка і вера

У 1985 годзе Аляксандру Раманькову прапанавалі паступаць у Вышэйшую партыйную школу. Прапанова вельмі прывабная, але пагадзіцца — значыць скончыць спартыўную кар'еру. А самага запаветнага — залатога медаля Алімпійскіх гульняў — у яго калекцыі яшчэ не было. Жонка перакапала застацца ў спорце і дабіцца сваёй мэты. «Як можна сыходзіць са спорту ў самым росквіце гадоў, не дасягнуўшы галоўнай мэты?» — разважае Тамара Віктараўна.

Падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў у Сеуле прымусіла Аляксандра Раманькова вельмі шмат часу праводзіць не дома: спаборніцтвы, працяглыя зборы — класіка спартыўнага жыцця. А дома маладая жонка, ужо нарадзілася дачка. «Аднойчы ў тэлефоннай размове Тома сказала: «Саша, я так стамілася, калі я цябе ўбачу?». Я ёй адказаў проста: «Калі выйграю залаты медаль, ты мяне ўбачыш па тэлевізары». І калі ў Сеуле ў мяне бралі інтэрв'ю пасля перамогі, я сказаў у камеру: «Тома, я ж абяцаў, што ты мяне ўбачыш, калі я выйграю залаты медаль. Я выйграў!» — распавядае Аляксандр Раманькоў.

**«Галоўнае — гэта прыклад бацькоў. Які сэнс ад таго, што я буду чытаць дзіцяці лекцыі аб тым, як трэба сябе паводзіць, а сама зраблю роўна наадварот?»**

«Калі ён выступаў у Сеуле, я думала, пасівею. Глядзела Алімпійскія гульні і баялася, каб у мяне сэрца не выскачыла. Лепш самому выступаць, чым перажываць за кагосьці, асабліва за каханага чалавека», — адзначае Тамара Віктараўна.

Чамусьці аб ахвярах, на якія ідуць жонкі спартсменаў дзеля медалёў мужоў, кажуць мала. А было б, напрыклад, у Аляксандра Раманькова алімпійскае «золата», калі б яго жонка не пагадзілася адна спраўляцца з маленькай дачкой? А да гэтага правесці цяжарнасць у адзіноце, пакуль муж на зборах і спаборніцтвах?

«Першыя гады сямейнага жыцця не былі бясхмарныя. Саша пастаянна ў раз'ездах, як правіла, 21 дзень на зборах, тыдзень — дома. А я цяжарная, у чужой, яшчэ нязвыклай кватэры. Мне 20 гадоў, мне хочацца, каб муж пра мяне клапаціўся... Я прывыкла да руху, трэніровак, спаборніцтваў, а спорт з майго жыцця забралі. І я засталася, па сутнасці, адна. Так цяжка было, што выць хацелася», — успамінае Тамара Віктараўна. Але гэтыя складанасці перакрываюцца больш светлымі момантамі. «Тамары нараджаць з дня на дзень. А я з'язджаю на чэмпіянат свету ў Іспанію. Там усе ведалі, што ў мяне вось-вось павінна нарадзіцца дзіця. Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі фехтавання асабіста кожны дзень тэлефанаваў у Мінск і даведваўся, ці не нарадзіла Раманькова. І кожны дзень мне даваў справаздачу, што не нарадзіла. А як толькі я вярнуўся — у нас нарадзілася Лена. Вось гэта было шчасце, найважнейшае за ўсе медалі», — успамінае Аляксандр Анатольевіч.



Раманьковы з унучкай.

## Элемент чацвёрты. Дзеці, унукі і... каты

У Аляксандра і Тамары Раманьковых двое дзяцей — Алена і Андрэй. У іх ужо свае сем'і. Падрастаюць дзве ўнучкі. І жывуць два каты. «У нас некалі быў кот Кузьма рускай блакітнай пароды, якога называлі гаспадаром двара. Мы хадзілі з ім гуляць на вуліцу, і ён не даваў спуску ніводнаму сабаку, — успамінае Тамара Раманькова. — Лічу, у доме абавязкова павінен быць гадаванец. А калі ёсць дзеці — дык сам бог загадаў. Тады дзеці вучацца клапаціцца аб блізкім, набіраюцца адказнасці, і самае галоўнае — вучацца аддаваць любоў».

Як адзначаюць бацькі, сваім знакамітым прозвішчам Алена і Андрэй ніколі не карысталіся. І гэта была іх уласная пазіцыя. Хоць ніякіх асаблівых сакрэтаў выхавання малодшага пакалення ў сям'і Раманьковых няма. «Галоўнае — гэта прыклад бацькоў. Які сэнс ад таго, што я буду чытаць дзіцяці лекцыі аб тым, як трэба сябе паводзіць, а сама зраблю роўна наадварот? Мы ніяк асабліва не выхоўвалі дзяцей. Проста жылі — спакойна, мірна. Здараліся праблемы — разам іх вырашалі. Дзеці спатыкаліся — мы з імі размаўлялі, дапамагалі знайсці выйсце са складанай сітуацыі. Вось і ўсё выхаванне. Многае ім дазвалялі. Напрыклад, аднойчы, незадоўга да запланаванага рамонту, дазволілі маляваць на шпалерах. Усё роўна іх хутка мяняць, дык чаму б і не? Гэта было такое шчасце, не перадаць! Нам удалося выбудаваць даверлівыя адносіны з дзецьмі і з іх сябрамі. Яны любілі прыходзіць да нас у госці, некаторыя нават жылі ў нас, калі была такая неабходнасць. Вось і ўсё выхаванне — быць сабой і не мучыць дзяцей натацыямі», — дзеліцца Тамара Віктараўна.

І цяпер старэйшую ўнучку Мію, у якой не характар, а ўраган, ніхто не «перарабляе». «Унучак я вельмі люблю, але ўсё ж гэта не мае дзеці. І многія рашэнні, напрыклад, як іх лячыць, як апранаць, на якія секцыі аддаваць, — гэта зона адказнасці іх бацькоў. Я ў гэта не ўмешваюся. Дзяцей павінны выхоўваць бацькі, а не бабуля з дзядулем. А мы выдатна бавім час з унучкамі ў сваё задавальненне. Праўда, да задавальнення дадаецца і каласальная адказнасць», — расказвае Тамара Віктараўна.

## Элемент пяты. Рамантыка

«Перад Алімпійскімі гульнямі ў Сеуле Саша кожны дзень пісаў мне лісты. І кожны ліст быў напісаны асаблівым чынам: у вершах, катрэнам, малаком (прасам па паперы праводзіш і чытаеш), у люстраным адлюстраванні, нават азбукай Морзэ. Кожны дзень правярала паштовую скрыню і гадала, як будзе напісаны чарговы ліст», — успамінае Тамара Віктараўна.

«Нават праз 40 год сямейнага жыцця рамантыка застаецца. Але яна мяняецца, бо сям'я — не раўно рамантыка. Сям'я — гэта каханне, вядома, ёсць месца і звычцы, сям'я — гэта разуменне і давер. Я ўжо не ўяўляю, як без яго жыць, ён не ўяўляе, як без мяне. Далёка не ўсе сітуацыі, якія мы перажывалі, былі прыемнымі і рамантычнымі, а сям'я і каханне засталіся. Дзеці ўжо выраслі, жывуць асобна, мы цяпер удваіх. Можна больш часу прысвяціць сабе і адно аднаму. Мы ходзім на шпацыры, у кіно, на выставы, у рэстараны, ездзім за горад, вандруем, увосень ездзілі ва Уганду. І што гэта, калі не рамантыка праз 40 гадоў сямейнага жыцця? Другі цукерачна-букетны перыяд», — усміхаецца Тамара Раманькова.

## Элемент шосты, ён жа самы галоўны. Каханне

Вядома, нічога б гэтага не было без кахання. На якім яшчэ падмурку зможа 40 гадоў пратрымацца сям'я двух людзей з няпростымі характарамі, скарпіёнаў па знаку задыяка? І што яшчэ можа прымусіць поўнасцю змяніць жыццё і не пашкадаваць аб гэтым? «Вядома, не буду хітраваць, калі я зацяжарала Ленай, пакінуць спорт мне было вельмі нялёгка. Пасля родаў нават пачала трэніравацца, два разы на тыдзень з дачкой сядзела свякроў. Але трэніроўкі два разы на тыдзень — гэта нішто. І я зразумела, што трэба выбіраць: ці спорт, ці сям'я. Выбар быў відавочны. Прыйшлося пакінуць спорт. Так, былі шкадаванні, і гэта нармальна, — разважае Тамара Віктараўна. — Але я перакананая: сям'я для жанчыны важнейшая, чым алімпійскі медаль. Я зразумела: калі я выйшла замуж за такога чалавека, калі я сама далей у спорце не пайшла, значыць, так таму і быць. І ўсё склалася як нельга лепш. Сёння я цалкам задаволеная сваім жыццём, яно атрымалася. Я заўсёды зайздросціла сваім дзецям, таму што ў іх выдатныя тата. А ў мяне цудоўны муж, які разумее, што жанчыну трэба слухаць і чуць».

«А ў маёй жонкі толькі адзін недахоп — яна замужам», — устаўляе апошняе «шкельца» ў гэты калейдаскоп Аляксандр Анатольевіч.

Валерыя СЦЯЦКО.

# БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

| Наименование объекта | Капитальное строение № 121/С-16529 |
|---|---|
| Место-расположение объекта | Брестская обл., Дрогичинский район, Дрогичинский с/с, д. Гутово, ул. Советская, 28Б |
| Продавец объекта | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| Организатор торгов | Брестское ОУ № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| Площадь | 22,5 кв. м |
| Начальная цена продажи с учетом НДС | 8 520,00 руб. (восемь тыс. пятьсот двадцать руб. 00 коп.), в том числе НДС 20 % – 1 420,00 руб. (одна тыс. четыреста двадцать руб. 00 коп.) |
| Сумма задатка | 850,00 руб. (восемьсот пятьдесят руб. 00 коп.) |
| Информация о земельном участке | Земельный участок с кадастровым № 122082501601000003, площадь, га: 0,0301 |
| Характеристика объекта | Стены – кирпичные; кровля – шифер; полы – керамическая плитка; окна – ПВХ; двери – металлические, ПВХ; внутренняя отделка – оштукатурено и окрашено, декоративная штукатурка; отопление – печь, электроснабжение – центральное |
| Условия оплаты | По договоренности победителя торгов с собственником имущества |

**Торги состоятся 20 мая 2024 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9 этаже.

Документы для участия принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 до 16 мая 2024 года.

Для участия в торгах к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

Если на участие в торгах подана только одна заявка, то объект продается этому участнику (с его согласия) по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи заключается в течение 40 рабочих дней с даты проведения торгов.

Тел. (80162) 277518, (801644) 53382.

<u>К заявлению также прилагаются</u>:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором торгов с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Торги проводятся путем пошагового увеличения цены. Шаг торгов – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем торгов возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Затраты по оформлению правоустанавливающих документов несет покупатель. Регистрируется недвижимость в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

Договор купли-продажи по результатам проведения торгов должен быть подписан в течение 40 рабочих дней со дня проведения торгов.

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**(Организатор аукциона)**

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «МТЗ» (Продавец).**

Аукцион состоится **28.05.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

### Лот № 1: чердачное помещение, инв. № 500/D-708113334, 40,9 кв. м, г. Минск, ул. Некрасова, 28-264.

Начальная цена с НДС 20 % – 96 400,00 руб.
Задаток – 9 640,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **24.05.2024 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки» (www.cpo.by), г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390

**Продавец:** ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95, (+375 177-78-83-92). УНП 600017855

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (ipmtorgi.by)

**Предмет электронных торгов – спецтехника, бывшая в употреблении.**
Местонахождение:
Минская обл., Борисовский район, д. Трояновка

**Трактор ФЕНДТ-930,** 2006 г. в., инв. № 13308027.
**Начальная цена с НДС 20 % – 199 200,00 бел. руб.**

**Дополнительная информация:** все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять) рабочих дней** после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | Победитель аукциона, либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона не позднее **5 (пяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи |

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,5 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.
Победитель аукциона, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, также **оплачивает затраты продавца** на проведение оценки в сумме 250 бел. руб. и затраты по публикации извещения в газете

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 21.05.2024 с 11.00 по 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.05.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29)-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества со снижением на 50 %

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00045** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** учреждение образования «Молодечненский торгово-экономический колледж» Белкоопсоюза, 222310, Минская обл., г. Молодечно, пл. Центральная, 1, тел. 8 (0176) 777569.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**<u>Дата и время проведения повторных электронных торгов 10 мая 2024 г. в 09.00</u>** <u>(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).</u>

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 250/С-1833, площадью 2027,9 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, 1959 г. п., наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: цокольный этаж. Кап. строение с инв. № 250/С-25204 площадью 54,1 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б/1, год постройки не установлен, наименование – здание гаража, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строения находятся на зем.участке с кадастровым № 243500000004000064 площадью 0,1852 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, целевое назначение – зем. участок для содержания и обслуживания объектов административного назначения и гаража (право постоянного пользования).

**Обременения:** договоры аренды, с условиями которых можно ознакомиться по предварительному согласованию с Продавцом.

**Нач. цена: 1 083 780,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**

**Задаток: 108 378,00 бел. руб.**

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by» с учетом Рекомендаций по отчуждению имущества организациями потребительской кооперации, утвержденными Постановлением Правления Белкоопсоюза 30.08.2019 № 263 с изм. и доп.

Для участия в торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам: **<u>до 16.00 08.05.2024.</u>**

*Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код категории назначения перевода: для юр. лиц и индивид. предпринимателей – OTHR; для физ. лиц – MP2B (платеж с текущего (расчетного) банковского счета физ. лица) или CASH (платеж наличными в кассе банка). Код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса).*

**<u>Условия повторных электронных торгов</u>:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов и утверждения протокола эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. Расходы продавца на проведение независимой оценки составляют 873,83 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Имущество, бывшее в употреблении. Победитель эл. торгов (претендент на покупку) приобретает объект по фактическому состоянию с учетом возможности наличия скрытых дефектов. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в эл. торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by – в разделе «недвижимое имущество» – «административные здания и помещения». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Ковшель Зинаида Сергеевна, +375 29 8142660.

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества должника

Аукцион состоится **29.05.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

### Лот № 1: Административно-торговое помещение с инв. № 500/D-708167929.

Площадь – 2539,8 кв. м. Назначение: административно-торговое помещение. Принадлежностью являются дворовые сооружения и газоны. Адрес: г. Минск, ул. Матусевича, 35-4.

**Обременение:**

1. В отношении административно-торгового помещения с инв. № 500/D-708167929 имеются действующие договоры аренды.
2. Арест.

Начальная цена продажи – 5 491 800,00 руб.
Задаток – 549 180,00 руб.

Административно-торговое помещение с инв. № 500/D-708167929 находится в капитальном строении с инв. № 500/С-32287, расположенном на земельном участке 500000000006002282 площадью 2,8867 га. Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания здания многофункционального по ул. Матусевича, 35, зданий неустановленного назначения (здание административно-бытового корпуса, здание производственного корпуса, здание охраны) по ул. Матусевича, 35, корп. 1, 2, 3. Право общего долевого постоянного пользования земельным участком. Доля 3/25.

Шаг аукциона – 5 %.

